**Кірпіч, М. М.** З гісторыі канфесій / М. М. Кірпіч // Памяць: Ушацкі раён : гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі / рэдкал.: Г. К. Кісялёў [і інш.] ; уклад. М. М. Кірпіч ; мастак Э. Э. Жакевіч. – Мінск : Белта, 2003. – С. 577.

## З ГІСТОРЫІ КАНФЕСІЙ

З часоў старажытных Ушаччына пeражыла шмат супярэчлівых гадоў, што азнаменаваліся барацьбой за прыхаджан дзвюх галін хрысціянства: праваслаўя і каталіцызму.

Праваслаўе ішло сюды ад старажытнага Полацка. Каталіцызм – з захаду.

Спачатку большасць насельніцтва краю спавядала праваслаўе. Як адзначае даследчык гісторыі дойлідства А. М. Кулагін, на Ушаччыне было ўзведзена ў дарэвалюцыйны час шмат праваслаўных храмаў.

Гістарычныя факты сведчаць, што мясцовая знаць у асобах землеўладальнікаў нярэдка пасля каталіцызму прымала праваслаўе, ці наадварот. Усё залежала ад абставін. Усё ж у асноўным лёс Ушаччыны цесна і непарыўна звязаны з праваслаўем. Хрысціянская царква была стваральніцай самабытнай і вялікай культуры. Дойлідства і іканапіс мелі шанс на далейшае развіццё пры царкве.

Існавалі і сінагогі. Адна з іх, мураваная, стаяла ў в. Кублішчына.

У 1930-я гады амаль усе храмы Ушаччыны, як праваслаўныя, так і каталіцкія, у выніку так званай барацьбы з рэлігіяй значна пацярпелі. Большасць з іх была знішчана, а святары рэпрэсіраваны. Да вайны толькі ва Ушачах дзейнічала царква. Перад новым 1942 г. пасля доўгага перапынку адбылася імша ў касцёле.

Пасля Вялікай Айчыннай вайны на Ушаччыне не было ніводнага дзеючага храма ні адной з канфесій. Царква ва Ушачах была поўнасцю знішчана фашысцкай авіяцыяй. Часткова былі разбураны касцёлы ў Селішчы і ва Ушачах.

У пачатку 1990-х гадоў пачалося адраджэнне культавай дзейнасці ў краі. На падставе Закона Рэспублікі Беларусь «Аб свабодзе веравызнання і рэлігійных арганізацыях» Ушацкі райвыканком пачаў рэгістрацыю рэлігійных арганізацый. Першай у 1991 г. была зарэгістравана абшчына царквы Евангельскіх хрысціян-баптыстаў. Ініцыятарамі арганізацыі абшчыны былі 11 жыхароў гарпасёлка раёна, прэсвітэрам царквы – П. П. Лукашэвіч. Абшчына пабудавала храм ва Ушачах. У верасні 1993 года былі зарэгістраваны праваслаўныя Свята-Мікалаеўская і Свята-Параскевіцкая цэрквы ва Ушачах і Арэхаўне. Спачатку вернікі выкарыстоўвалі для малебна дом ва Ушачах, а потым набажэнствы пачалі праходзіць у адрэстаўрыраванай царкве ў Арэхаўне. Пачынаў справу аднаўлення праваслаўнай царквы на Ушаччыне айцец Генадзь (Г. М. Драздовіч).

Восенню 1994 года быў зарэгістраваны Ушацкі касцёл Марыі Будслаўскай, што ўвайшоў у склад Мінска-Магілёўскай епархіі. У студзені 1996 года Ушацкі райвыканкам перадаў вернікам памяшканне касцёла, якое патрабуе рэстаўрацыі і рамонту. Першая імша ў яшчэ не адрамантаваным касцёле адбылася ў канцы ліпеня 1999 года. Праводзіў яе ксёндз Мечыслаў Янчынін, грамадзянін Польшчы, святар касцёла ў г. Лепель.

У пачатку 1997 года ў раёне зарэгістравана царква «Благадаць» хрысціян веры евангельскай. Узначальвае яе пастар Пётр Волкаў. У 1999 годзе царква набыла дом, мэтай прыстасавання яго пад культавае памяшканне.

**М. М. Кірпіч**